*Неафіцыйны пераклад зроблены ў Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў*

# РЭГЛАМЕНТ
# Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў

(у рэд. пастаноў Цэнтральнай камісіі ад 03.01.2017 № 1, ад 08.05.2020 № 11)

Гэты Рэгламент вызначае парадак работы Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў (далей – Цэнтральная камісія) і яе апарату.

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Цэнтральная камісія з'яўляецца дзяржаўным органам, які арганізуе ў межах сваіх паўнамоцтваў падрыхтоўку і правядзенне выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (далей – Палата прадстаўнікоў) і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (далей – Савет Рэспублікі), дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў, рэспубліканскіх рэферэндумаў. Цэнтральная камісія вырашае пытанні, звязаныя з арганізацыяй адклікання дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі.

2. Цэнтральная камісія ў сваёй дзейнасці кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь (далей – Выбарчы кодэкс) і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

3. Дзейнасць Цэнтральнай камісіі грунтуецца на прынцыпах законнасці, незалежнасці, калегіяльнасці, адкрытасці, галоснасці.

Старшыня Цэнтральнай камісіі інфармуе сродкі масавай інфармацыі аб дзейнасці Цэнтральнай камісіі, аб выбарчых кампаніях, рэспубліканскіх рэферэндумах, якія праходзяць у Рэспубліцы Беларусь.

У перыяды падрыхтоўкі і правядзення выбараў і рэферэндумаў сакратар Цэнтральнай камісіі, кіраўнікі структурных падраздзяленняў апарату Цэнтральнай камісіі даюць неабходныя растлумачэнні прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі па пытаннях сваёй кампетэнцыі.

4. Цэнтральная камісія збіраецца на сваё першае пасяджэнне не пазней трох дзён з дня яе ўтварэння ў правамоцным складзе.

5. Рашэнні Цэнтральнай камісіі, прынятыя ў межах яе паўнамоцтваў, абавязковыя для выканання ніжэйстаячымі выбарчымі камісіямі, камісіямі па рэферэндуму, камісіямі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата (далей – ніжэйстаячыя камісіі), усімі дзяржаўнымі органамі, палітычнымі партыямі, іншымі грамадскімі аб’яднаннямі, іншымі арганізацыямі, а таксама грамадзянамі.

6. Цэнтральная камісія – пастаянна дзеючы орган, з’яўляецца юрыдычнай асобай, мае пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і са сваёй назвай, іншыя пячаткі і штампы, неабходныя для яе дзейнасці, а таксама рахунак у банку.

7. Месца знаходжання Цэнтральнай камісіі: 220010, г. Мінск, вул. Савецкая, 11, Дом Урада.

## ГЛАВА 2
## СТАРШЫНЯ, НАМЕСНІК СТАРШЫНІ І САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ

8. Старшыня Цэнтральнай камісіі:

арганізуе работу Цэнтральнай камісіі;

прадстаўляе Цэнтральную камісію ва ўзаемаадносінах з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнымі органамі, ніжэйстаячымі камісіямі, сродкамі масавай інфармацыі, палітычнымі партыямі, іншымі грамадскімі аб’яднаннямі, іншымі арганізацыямі, выбарчымі органамі замежных дзяржаў, міжнароднымі арганізацыямі і грамадзянамі;

склікае пасяджэнні Цэнтральнай камісіі і старшынствуе на іх;

падпісвае пастановы Цэнтральнай камісіі, пратаколы пасяджэнняў, а таксама дагаворы і іншыя дакументы ад імя Цэнтральнай камісіі;

ажыццяўляе кантроль за выкананнем рашэнняў Цэнтральнай камісіі;

дае даручэнні намесніку Старшыні, сакратару і членам Цэнтральнай камісіі;

зацвярджае структуру і штатны расклад апарату Цэнтральнай камісіі ў межах устаноўленай колькасці работнікаў і расходаў на яго ўтрыманне;

ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва апаратам Цэнтральнай камісіі, назначае на пасады і вызваляе ад пасад работнікаў апарату, выконвае іншыя функцыі, звязаныя з арганізацыяй работы апарату Цэнтральнай камісіі;

распараджаецца ў межах каштарыса расходаў фінансавымі сродкамі, якія выдзелены з рэспубліканскага бюджэту Цэнтральнай камісіі на яе ўтрыманне, а таксама на падрыхтоўку і правядзенне выбараў, рэспубліканскіх рэферэндумаў, адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі;

праводзіць асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб (далей – асабісты прыём);

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя Выбарчым кодэксам і гэтым Рэгламентам.

Старшыня Цэнтральнай камісіі выдае распараджэнні па пытаннях арганізацыі дзейнасці Цэнтральнай камісіі і яе апарату.

9. Намеснік Старшыні Цэнтральнай камісіі:

выконвае абавязкі Старшыні Цэнтральнай камісіі ў перыяд яго часовай адсутнасці, за выключэннем паўнамоцтваў, якія ажыццяўляюцца сакратаром Цэнтральнай камісіі ў адпаведнасці з абзацам дзясятым пункта 10 гэтага Рэгламенту;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя Выбарчым кодэксам і гэтым Рэгламентам.

10. Сакратар Цэнтральнай камісіі:

арганізуе перспектыўнае і бягучае планаванне работы Цэнтральнай камісіі, кантралюе выкананне ўказаных планаў;

кантралюе работу па падрыхтоўцы пасяджэнняў Цэнтральнай камісіі, арганізуе падрыхтоўку семінараў і нарад, якія праводзяцца Цэнтральнай камісіяй;

уносіць прапановы Старшыні Цэнтральнай камісіі аб разглядзе на пасяджэннях Цэнтральнай камісіі адпаведных пытанняў;

курыруе пытанні арганізацыйнай, аналітычнай работы і матэрыяльна-тэхнічнага абслугоўвання Цэнтральнай камісіі;

уносіць прапановы Старшыні Цэнтральнай камісіі аб прыёме на работу ў апарат Цэнтральнай камісіі;

у перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў уносіць на разгляд Старшыні Цэнтральнай камісіі прапановы аб змене структуры і колькасці апарату Цэнтральнай камісіі;

арганізуе работу па інфармацыйным напаўненні і функцыянаванні афіцыйнага сайта Цэнтральнай камісіі ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт;

падпісвае пастановы Цэнтральнай камісіі і пратаколы пасяджэнняў;

у адсутнасць Старшыні Цэнтральнай камісіі ажыццяўляе агульнае кіраўніцтва апаратам Цэнтральнай камісіі, выдае распараджэнні па адміністрацыйна-гаспадарчых пытаннях, аб заахвочванні, прэміраванні, камандзіраванні работнікаў апарату ў межах Рэспублікі Беларусь, аб прадастаўленні ім працоўных водпускаў; разглядае дакументы, якія паступілі ў Цэнтральную камісію, вызначае выканаўцаў і падпісвае выкананыя дакументы; праводзіць асабісты прыём;

ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя Выбарчым кодэксам і гэтым Рэгламентам.

11. Старшыня і сакратар Цэнтральнай камісіі працуюць на пастаяннай аснове.

У выпадку часовай адсутнасці намесніка Старшыні або сакратара Цэнтральнай камісіі іх абавязкі могуць быць ускладзены на іншых яе членаў па рашэнні Цэнтральнай камісіі. Пры гэтым рашэнне аб ускладанні абавязкаў намесніка Старшыні Цэнтральнай камісіі на іншага члена Цэнтральнай камісіі павінна быць папярэдне ўзгоднена з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

12. Па рашэнні Цэнтральнай камісіі намеснік Старшыні Цэнтральнай камісіі ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў можа вызваляцца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў з выплатай заработнай платы за кошт сродкаў, выдзеленых на падрыхтоўку і правядзенне выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў.

## ГЛАВА 3
## ЧЛЕНЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ

13. Члены Цэнтральнай камісіі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэспубліканскіх рэферэндумаў, галасаванні аб адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі ажыццяўляюць сваю дзейнасць у адпаведнасці з планамі работы Цэнтральнай камісіі.

14. Член Цэнтральнай камісіі мае права:

уносіць прапановы ў парадак дня пасяджэння Цэнтральнай камісіі, а таксама прапановы па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Цэнтральнай камісіі;

удзельнічаць у падрыхтоўцы праектаў пастаноў Цэнтральнай камісіі;

выступаць на пасяджэннях Цэнтральнай камісіі і патрабаваць правядзення галасавання па ўнесеных прапановах;

задаваць удзельнікам пасяджэння Цэнтральнай камісіі пытанні ў адпаведнасці з парадкам дня і атрымліваць на іх адказы па сутнасці;

знаёміцца з дакументамі і матэрыяламі Цэнтральнай камісіі і ніжэйстаячых камісій;

прымаць удзел у семінарах, нарадах, якія праводзяцца Цэнтральнай камісіяй;

ажыццяўляць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам і гэтым Рэгламентам.

15. Член Цэнтральнай камісіі абавязаны:

захоўваць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, выконваць патрабаванні Выбарчага кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі;

удзельнічаць у пасяджэннях Цэнтральнай камісіі, а ў выпадку немагчымасці ўдзелу ў іх паведамляць аб гэтым Старшыні або сакратару Цэнтральнай камісіі;

прымаць удзел у падрыхтоўцы пасяджэнняў Цэнтральнай камісіі і праверках, якія праводзяцца Цэнтральнай камісіяй;

выконваць рашэнні Цэнтральнай камісіі, даручэнні Старшыні, намесніка Старшыні і сакратара Цэнтральнай камісіі, дадзеныя ў межах іх паўнамоцтваў, і інфармаваць аб выкананні ўказаных рашэнняў і даручэнняў ва ўстаноўлены тэрмін;

не ўчыняць дзеянняў, якія дыскрэдытуюць Цэнтральную камісію.

16. Па рашэнні Цэнтральнай камісіі яе члены ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў могуць вызваляцца ад выканання працоўных (службовых) абавязкаў з выплатай заработнай платы за кошт сродкаў, выдзеленых на падрыхтоўку і правядзенне выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў.

## ГЛАВА 4
## ЧЛЕНЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ З ПРАВАМ ДАРАДЧАГА ГОЛАСУ

17. Пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь мае права з дня яго рэгістрацыі накіраваць у Цэнтральную камісію члена Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу.

Тэрмін паўнамоцтваў члена Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу пачынаецца з дня атрымання Цэнтральнай камісіяй ад кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь пісьмовага паведамлення аб накіраванні члена Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу.

18. Член Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу мае права:

уносіць у парадак дня пасяджэння Цэнтральнай камісіі прапановы па пытаннях, якія ўваходзяць у яе кампетэнцыю, і патрабаваць правядзення галасавання па іх;

выступаць на пасяджэннях Цэнтральнай камісіі;

задаваць удзельнікам пасяджэння Цэнтральнай камісіі пытанні ў адпаведнасці з парадкам дня і атрымліваць на іх адказы;

знаёміцца з дакументамі і матэрыяламі, якія разглядаюцца на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі.

19. Член Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу не мае права:

удзельнічаць у праверках, якія праводзяцца Цэнтральнай камісіяй, у галасаванні пры прыняцці камісіяй рашэнняў;

даваць растлумачэнні і ўказанні, рабіць паведамленні ад імя Цэнтральнай камісіі.

20. Член Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу абавязаны захоўваць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, выконваць патрабаванні Выбарчага кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб

выбарах, не ўчыняць дзеянняў, якія дыскрэдытуюць Цэнтральную камісію або перашкаджаюць яе рабоце.

## ГЛАВА 5
## ПАРАДАК РАЗГЛЯДУ ПЫТАННЯЎ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІЯЙ

21. Любое пытанне, якое адносіцца да кампетэнцыі Цэнтральнай камісіі, можа быць разгледжана на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі. Кампетэнцыя Цэнтральнай камісіі вызначана ў Выбарчым кодэксе.

Рашэнні Цэнтральнай камісіі прымаюцца ў форме пастаноў.

22. Выключна калегіяльна Цэнтральнай камісіяй разглядаюцца пытанні:

22.1. аб растлумачэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі ў мэтах яго аднастайнага прымянення;

22.2. аб звароце ў выпадку неабходнасці да суб’ектаў права заканадаўчай ініцыятывы з прапановай аб тлумачэнні Выбарчага кодэкса і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі;

22.3. аб утварэнні выбарчых акруг па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і ўстанаўленні сярэдняй колькасці выбаршчыкаў на выбарчую акругу па Рэспубліцы Беларусь;

22.4. аб парадку ўдзелу грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь, у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і рэспубліканскім рэферэндуме, а таксама аб парадку ўтварэння ўчасткаў для галасавання; аб прыпісцы па прадстаўленні Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь участкаў для галасавання, што ўтвараюцца за межамі Рэспублікі Беларусь, да адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак або выбарчых акруг на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

22.5. аб правамоцнасці вылучэння кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі, рэгістрацыі вылучаных кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі, падвядзенні вынікаў выбараў членаў Савета Рэспублікі, рэгістрацыі выбраных членаў Савета Рэспублікі, скліканні першай пасля выбараў сесіі Савета Рэспублікі;

22.6. аб рэгістрацыі:

ініцыятыўных груп грамадзян па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;

кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, іх давераных асоб і прадстаўнікоў па фінансавых пытаннях;

ініцыятыўнай групы грамадзян па правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму і пытанняў, прапанаваных ёю на рэспубліканскі рэферэндум;

ініцыятыўнай групы выбаршчыкаў па збору подпісаў у падтрымку прапановы аб узбуджэнні пытання аб адкліканні дэпутата Палаты прадстаўнікоў;

ініцыятыўнай групы грамадзян па рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы і праекта закона;

22.7. аб вызначэнні парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі ў перадвыбарнай кампаніі;

22.8. аб каштарысе расходаў па правядзенні выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму, адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў;

22.9. аб стварэнні пазабюджэтнага фонду па правядзенні выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму для добраахвотнага пералічэння ў яго сродкаў арганізацый, у тым ліку грамадскіх аб'яднанняў, грамадзян і зацвярджэнні палажэння аб фондзе;

22.10. аб размеркаванні грашовых сродкаў, выдзеленых з рэспубліканскага бюджэту і пазабюджэтнага фонду, паміж ніжэйстаячымі камісіямі;

22.11. аб устанаўленні формаў бюлетэняў і спісу грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах, рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутатаў, пратаколаў камісій і іншых дакументаў па выбарах, рэферэндуму, адкліканні дэпутатаў, узораў скрынак для галасавання і пячатак камісій;

22.12. аб вызначэнні мер па забеспячэнні захаванасці скрынак для галасавання і дакументаў па выбарах, рэферэндуму ў перыяд датэрміновага галасавання;

22.13. аб устанаўленні, што пры адначасовым правядзенні выбараў рознага ўзроўню, выбараў і рэферэндуму спісы грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах рознага ўзроўню, выбарах і рэферэндуме, а таксама тэрытарыяльныя камісіі могуць з'яўляцца агульнымі па выбарах рознага ўзроўню, выбарах і рэферэндуме;

22.14. аб падвядзенні вынікаў выбараў, рэферэндуму;

22.15. аб рэгістрацыі выбраных дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, скліканні першай пасля выбараў сесіі Палаты прадстаўнікоў;

22.16. аб правядзенні другога тура галасавання, паўторных выбараў і выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у выпадку вакансіі пасады Прэзідэнта, а таксама паўторнага галасавання па рэферэндуму;

22.17. аб арганізацыі адклікання дэпутата Палаты прадстаўнікоў і члена Савета Рэспублікі, назначэнні паўторных выбараў і выбараў

дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў замест выбыўшых і забеспячэнні іх правядзення;

22.18. аб разглядзе скаргаў на рашэнні ніжэйстаячых камісій;

22.19. аб унясенні суб'ектам права заканадаўчай ініцыятывы прапановы аб удасканальванні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата і члена Савета Рэспублікі;

22.20. аб вызначэнні пры правядзенні выбараў, рэспубліканскага рэферэндуму парадку і відаў заахвочвання членаў камісій, работнікаў апаратаў камісій, асоб, якія ажыццяўляюць вядзенне бухгалтарскага ўліку і складанне справаздачнасці ў камісіях, а таксама работнікаў рабочых груп і іншых структур, створаных для арганізацыйнага, прававога і тэхнічнага забеспячэння выбараў і рэферэндуму;

22.21. аб прыняцці Рэгламенту Цэнтральнай камісіі, унясенні ў яго змяненняў і дапаўненняў.

23. Па асобных пытаннях, якія не патрабуюць абмеркавання, пастановы Цэнтральнай камісіі могуць прымацца без разгляду іх на пасяджэнні шляхам апытання членаў Цэнтральнай камісіі.

## ГЛАВА 6
## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ ПАСЯДЖЭННЯЎ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ

24. Пасяджэнне Цэнтральнай камісіі правамоцнае, калі ў ім прымае ўдзел не менш 8 членаў Цэнтральнай камісіі.

Пасяджэнні Цэнтральнай камісіі праводзяцца па месцы яе знаходжання. У асобных выпадках Цэнтральная камісія можа праводзіць выязныя пасяджэнні, а таксама пасяджэнні ў рэжыме відэаканферэнцыі.

Паведамленне аб месцы, даце, часе і парадку дня чарговага пасяджэння Цэнтральнай камісіі размяшчаецца на яе афіцыйным сайце ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт.

25. Пасяджэнні Цэнтральнай камісіі склікаюцца па меры неабходнасці Старшынёй Цэнтральнай камісіі, а таксама па патрабаванні не менш 4 членаў Цэнтральнай камісіі і праводзяцца Старшынёй, а ў выпадку яго адсутнасці або па яго даручэнні – намеснікам Старшыні Цэнтральнай камісіі.

26. Пасяджэнні Цэнтральнай камісіі праводзяцца адкрыта і галосна. На пасяджэннях маюць права прысутнічаць наглядальнікі, замежныя (міжнародныя) наглядальнікі, прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі, акрэдытаваныя пры Цэнтральнай камісіі, а таксама запрошаныя на пасяджэнне кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, у члены Савета Рэспублікі, іх davераныя асобы і прадстаўнікі.

На пасяджэнні Цэнтральнай камісіі могуць запрашацца члены ніжэйстаячых камісій, прадстаўнікі дзяржаўных органаў, органаў мясцовага кіравання і самакіравання, палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў і іншых арганізацый, вучоныя, эксперты, спецыялісты для прадастаўлення звестак, неабходных для разгляду адпаведных пытанняў.

На пасяджэннях Цэнтральнай камісіі прысутнічаюць работнікі яе апарату.

26[1]. Пасяджэнні могуць праводзіцца ў адсутнасць наглядальнікаў, замежных (міжнародных) наглядальнікаў, прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі і пры абмежаванні колькасці асоб, якія запрашаюцца, калі гэта неабходна для забеспячэння бяспекі асоб, якія прысутнічаюць на пасяджэнні, у тым ліку прадухілення распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў. Пры гэтым арганізуецца прамая трансляцыя пасяджэння на афіцыйным сайце Цэнтральнай камісіі ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт.

27. Сакратар Цэнтральнай камісіі ўзгадняе са Старшынёй Цэнтральнай камісіі дату пасяджэння, парадак дня і спіс запрошаных асоб.

Сакратар Цэнтральнай камісіі паведамляе членам Цэнтральнай камісіі пра будучае пасяджэнне, як правіла, не пазней чым за тры дні да пасяджэння.

28. Кіраўнікі структурных падраздзяленняў апарату Цэнтральнай камісіі перад пасяджэннем Цэнтральнай камісіі прадстаўляюць сакратару Цэнтральнай камісіі матэрыялы, якія падлягаюць разгляду на пасяджэнні.

Праект пастановы Цэнтральнай камісіі візіруецца работнікам апарату Цэнтральнай камісіі, які падрыхтаваў праект, і кіраўніком або іншым работнікам структурнага падраздзялення апарату, адказнага за прававое забеспячэнне дзейнасці Цэнтральнай камісіі.

Праекты пастаноў Цэнтральнай камісіі, якія закранаюць інтарэсы іншых арганізацый, узгадняюцца з гэтымі арганізацыямі. Неабходнасць узгаднення праектаў рашэнняў з іншымі арганізацыямі вызначае Старшыня Цэнтральнай камісіі.

Праекты пастаноў Цэнтральнай камісіі па пытаннях растлумачэння заканадаўства накіроўваюцца членам Цэнтральнай камісіі, як правіла, не пазней чым за тры дні да пасяджэння для азнаямлення і ўнясення па іх адпаведных прапаноў.

29. Для разгляду пытанняў, якія адносяцца да кампетэнцыі Цэнтральнай камісіі, па рашэнні Цэнтральнай камісіі або яе Старшыні могуць стварацца рабочыя групы або іншыя структуры з ліку членаў Цэнтральнай камісіі, работнікаў яе апарату, вучоных, спецыялістаў і экспертаў з іншых дзяржаўных органаў і іншых арганізацый.

30. Пры разглядзе праекта пастановы Цэнтральная камісія заслухоўвае дакладчыка і праводзіць абмеркаванне праекта.

Працягласць выступленняў на пасяджэннях Цэнтральнай камісіі ўстанаўліваецца старшынствуючым па ўзгадненні з дакладчыкамі і не павінна перавышаць для даклада 10 хвілін, выступлення – 5 хвілін, даведкі – 3 хвіліны, абвяшчэння інфармацыі, заяў і зваротаў – 2 хвіліны, калі іншае не ўстаноўлена Цэнтральнай камісіяй.

На галасаванне ставяцца папраўкі, унесеныя толькі членамі Цэнтральнай камісіі, у тым ліку з правам дарадчага голасу.

31. Рашэнні Цэнтральнай камісіі прымаюцца адкрытым галасаваннем большасцю галасоў агульнага складу камісіі. Пры галасаванні член камісіі галасуе асабіста шляхам узняцця рукі. Пры роўнай колькасці галасоў, пададзеных «за» і «супраць», прынятым лічыцца рашэнне, за якое прагаласаваў старшынствуючы.

Рашэнні Цэнтральнай камісіі ўступаюць у сілу з дня іх прыняцця, калі іншае не прадугледжана ў саміх рашэннях.

Член Цэнтральнай камісіі, не згодны з прынятым рашэннем, мае права ў пісьмовай форме выказаць асобную думку, якая прыкладаецца да адпаведнага пратаколу.

32. Старшынствуючы на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі:

вядзе пасяджэнне Цэнтральнай камісіі;

арганізуе абмеркаванне пытанняў парадку дня пасяджэння Цэнтральнай камісіі, ставіць іх на галасаванне;

дае слова для выступлення членам Цэнтральнай камісіі і запрошаным асобам;

ставіць на галасаванне ўсе прапановы членаў Цэнтральнай камісіі ў парадку іх паступлення;

арганізуе галасаванне і абвяшчае яго вынікі;

забяспечвае выкананне палажэнняў гэтага Рэгламенту членамі Цэнтральнай камісіі і запрошанымі асобамі.

Старшынствуючы пры галасаванні галасуе апошнім.

33. Пасяджэнне Цэнтральнай камісіі афармляецца пратаколам, які падпісваецца старшынствуючым на пасяджэнні і сакратаром Цэнтральнай камісіі.

Пратакол пасяджэння афармляецца работнікам апарату Цэнтральнай камісіі.

Да пратаколаў пасяджэнняў Цэнтральнай камісіі прыкладаюцца пастановы Цэнтральнай камісіі, прынятыя на пасяджэнні, дакументы да іх, а таксама асобныя думкі членаў Цэнтральнай камісіі.

34. Членамі Цэнтральнай камісіі, якія прысутнічалі на яе адпаведных пасяджэннях, падпісваюцца наступныя пратаколы Цэнтральнай камісіі:

аб устанаўленні па Рэспубліцы Беларусь колькасці выбаршчыкаў, якія паставілі ў падпісных лістах свае подпісы ў падтрымку прапановы аб вылучэнні кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь;

аб устанаўленні вынікаў выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

аб выніках збору подпісаў грамадзян за прапанову аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму;

аб устанаўленні вынікаў рэспубліканскага рэферэндуму;

аб выніках збору подпісаў грамадзян за прапанову аб унясенні праекта закона ў Палату прадстаўнікоў.

Член Цэнтральнай камісіі, які выказаў асобную думку, падпісвае пратакол з адзнакай «маю асобную думку».

35. Праекты пастаноў Цэнтральнай камісіі не пазней чым на наступны дзень пасля пасяджэння дапрацоўваюцца ў адпаведных структурных падраздзяленнях апарату Цэнтральнай камісіі з улікам паправак, прынятых на пасяджэнні.

36. Пастановы Цэнтральнай камісіі падпісваюцца Старшынёй і сакратаром Цэнтральнай камісіі, на пастановах ставіцца гербавая пячатка Цэнтральнай камісіі.

Пастановы нумаруюцца ў храналагічным парадку ў межах каляндарнага года.

37. Пастановы Цэнтральнай камісіі па ўказанні сакратара Цэнтральнай камісіі накіроўваюцца зацікаўленым асобам, у сродкі масавай інфармацыі для апублікавання, размяшчаюцца на афіцыйным сайце Цэнтральнай камісіі ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт.

38. Для прыняцця пастановы Цэнтральнай камісіі шляхам апытання трэба апытаць не менш 8 членаў Цэнтральнай камісіі. Апытанне праводзіцца работнікам апарату Цэнтральнай камісіі, які падрыхтаваў праект пастановы. Думка апытаных членаў Цэнтральнай камісіі адлюстроўваецца ў апытальнам лісце. Апытальны ліст падпісваецца работнікам, які праводзіў апытанне, і прыкладаецца да пастановы Цэнтральнай камісіі.

## ГЛАВА 7
## ПАРАДАК РАЗГЛЯДУ ЗВАРОТАЎ

39. Работа са зваротамі (прапановамі, заявамі, скаргамі) грамадзян і юрыдычных асоб вядзецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб і Выбарчым кодэксам.

40. Звароты аб парушэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб выбарах, рэферэндуме, адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі разглядаюцца ў трохдзённы тэрмін з дня паступлення звароту, а звароты, звязаныя з рэалізацыяй грамадзянамі выбарчага права, права на ўдзел

у рэферэндуме, якія паступілі ў дзень выбараў, рэферэндуму, галасавання аб адкліканні дэпутата, члена Савета Рэспублікі, – неадкладна. Звароты, у якіх змяшчаюцца звесткі, што патрабуюць праверкі, разглядаюцца не пазней чым у дзесяцідзённы тэрмін з дня паступлення.

41. Звароты грамадзян і юрыдычных асоб падлягаюць разгляду на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі, калі па іх прыняты рашэнні ніжэйстаячых камісій. Па ініцыятыве Старшыні Цэнтральнай камісіі або па патрабаванні не менш 4 яе членаў на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі разглядаюцца іншыя звароты грамадзян і юрыдычных асоб.

Звароты грамадзян і юрыдычных асоб, якія не патрабуюць калегіяльнага разгляду Цэнтральнай камісіяй, па даручэнні Старшыні Цэнтральнай камісіі разглядаюцца членамі Цэнтральнай камісіі, а таксама работнікамі яе апарату. У гэтым выпадку адказ на зварот падпісваецца Старшынёй або сакратаром Цэнтральнай камісіі.

42. Асабісты прыём праводзіцца штомесячна Старшынёй Цэнтральнай камісіі.

У перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў, рэспубліканскіх рэферэндумаў асабісты прыём арганізуецца не радзей двух разоў у тыдзень і можа ажыццяўляцца таксама сакратаром і членамі Цэнтральнай камісіі, а пры неабходнасці кіраўнікамі структурных падраздзяленняў апарату Цэнтральнай камісіі згодна з графікам, зацверджаным Старшынёй Цэнтральнай камісіі.

Арганізацыю асабістага прыёму забяспечваюць работнікі апарату Цэнтральнай камісіі.

$42^1$. Арганізацыйныя пытанні забеспячэння разгляду зваротаў, асабістага прыёму могуць дадаткова рэгулявацца распараджэннямі Старшыні Цэнтральнай камісіі.

## ГЛАВА 8
## АПАРАТ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ

43. Апарат Цэнтральнай камісіі ажыццяўляе прававое, арганізацыйнае, метадычнае, інфармацыйна-аналітычнае, фінансавае, дакументацыйнае, матэрыяльна-тэхнічнае і іншае забеспячэнне дзейнасці Цэнтральнай камісіі ў адпаведнасці з яе кампетэнцыяй.

44. Колькасць работнікаў апарату Цэнтральнай камісіі ўстанаўліваецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь па прадстаўленні Старшыні Цэнтральнай камісіі.

У складзе апарату Цэнтральнай камісіі ствараюцца структурныя падраздзяленні.

У перыяд падрыхтоўкі і правядзення выбараў і рэспубліканскіх рэферэндумаў Старшыня Цэнтральнай камісіі мае права часова павялічваць

колькасць работнікаў апарату Цэнтральнай камісіі і ўстанаўліваць памер аплаты іх працы ў межах выдзеленых на гэтыя мэты сродкаў.

45. Арганізацыя работы апарату Цэнтральнай камісіі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з гэтым Рэгламентам, а таксама палажэннямі аб структурных падраздзяленнях апарату, службовымі інструкцыямі іх работнікаў, інструкцыямі па справаводстве, аб арганізацыі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у Цэнтральнай камісіі, якія зацвярджаюцца Старшынёй Цэнтральнай камісіі, і даручэннямі Старшыні Цэнтральнай камісіі.